ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1982
18
САКАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 10 (1348)
Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з мая 1922 года

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

**УПЭЎНЕНЫ Ў СВАІХ СІЛАХ, ПОЎНЫ АПТЫМІЗМУ САВЕЦКІ НАРОД ІДЗЕ ПА ШЛЯХУ, УКАЗАНАМУ ПАРТЫЯЙ ЛЕНІНА. НЯМА СУМНЕННЯ, ШТО ВЫЗНАЧАНЫЯ XXVI З'ЕЗДАМ КПСС ЗАДАЧЫ КАМУНІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА БУДУЦЬ ПАСПЯХОВА ВЫРАШАНЫ. ЗАЛОГ ТАМУ — НЕПАРУШНАЯ ЗГУРТАВАНАСЦЬ НАРОДАЎ СССР, ІХ ДРУЖНАЯ СУМЕСНАЯ РАБОТА Ў ІМЯ ГЭТАЙ ВЯЛІКАЙ МЭТЫ.**

*(З пастановы ЦК КПСС «Аб 60-й гадавіне ўтварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік»).*

"Беларускі універсітэт"

## тэлетайп

• Учора • Сёння • Заўтра •

### НА V ЗЛЁЦЕ

**членаў добраахвотных народных дружын Маскоўскага раёна горада Мінска падведзены вынікі работы ДНД за мінулы год, вызначаны задачы па далейшаму ўдасканаленню іх дзейнасці. Адзначана станоўчая работа народных дружыннікаў БДУ імя У. І. Леніна па ахове правапарадку, прафілактыцы правапарушэнняў. Камандзір ДНД фізічнага факультэта У. Панарадаў і камандзір ДНД геаграфічнага факультэта А. Сазончык узнагароджаны Ганаровай граматай гарадскога штаба народных дружын.**

**В. ЯЦУХНА,**
**начальнік штаба ДНД БДУ імя У. І. Леніна.**

### АДБЫЛІСЯ СУСТРЭЧЫ

**вучняў 10-х класаў г. Мінска з кіраўніцтвам і вядучымі вучонымі універсітэта. Школьнікі пазнаёміліся з факультэтамі, спецыяльнасцямі, навукова-даследчымі лабараторыямі, арганізацыяй вучэбнага працэсу, дасягненнямі БДУ. Для будучых абітурыентаў былі арганізаваны прагляд кінафільма аб універсітэце, праведзена экскурсія ў музей гісторыі універсітэта і на выстаўкі.**

**Г. ГРЭЛЬ,**
**студэнтка журфака.**

### ТВОРЧАСЦІ ЯСЕНІНА

**быў прысвечаны вечар, які адбыўся ў актавай зале філалагічнага факультэта. Пра творчы шлях паэта расказаў старшыня камісіі па ўшанаванню памяці С. Ясеніна пісьменнік А. Панкратаў, блізка знаёмы з яго сям'ёй. На вечары прагучалі вершы і рамансы на вершы паэта ў выкананні лаўрэата Маскоўскага конкурсу вакалістаў В. Прокушавай.**

**Ч. ВІКТАРАЎ,**
**слухач падрыхтоўчага аддзялення.**

### З ЦІКАВАЙ ЛЕКЦЫЯЙ

**аб міжнародным становішчы выступіў перад замежнымі студэнтамі факультэта журналістыкі лектар таварыства «Веды», заслужаны дзеяч культуры БССР І. А. Бейдзін. Ён расказаў аб барацьбе сальвадорскіх патрыётаў, аб становішчы ў Польшчы, адказаў на шматлікія пытанні слухачоў.**

**Лекцыя была арганізавана дэканатам па рабоце з замежнымі студэнтамі.**

**А. ЛУКАШЭВІЧ,**
**студэнтка журфака.**

● **ПРАДСТАЎЛЯЕМ ДЭЛЕГАТА XXVII З'ЕЗДА ЛКСМБ**

# «З'ЕЗД ЧАКАЮ З НЕЦЯРПЛІВАСЦЮ»

СТУДЭНТЫ педагагічнага патока II курса хімфака працавалі ў лабараторыі. Быццам старажытныя алхімікі, чаруюць яны над прабіркамі і колбамі. А вось і Святлана Канаш, якая выбрана дэлегатам на XXVII з'езд ЛКСМБ.

Пакуль Святлана заканчвала адважваць рэактыў, я звярнулася да яе аднакурсніц.

Вольга Навоша, лепшая сяброўка Светы, староста групы, крыху падумала:

— Чалавек вельмі цікавы. Пасябравала я са Светай яшчэ на першай «бульбе» і не памятаю, каб мне было з ёю калі-небудзь сумна. Успамінаю СБА «Рамонкі», дзе Света была камандзірам. Гэта было цудоўна! І ў многім дзякуючы іменна ёй.

Заўсміхаліся дзяўчаты, успомніўшы будатрад, і наша размова пайшла жывей.

— Света — чалавек, для якога актыўная жыццёвая пазіцыя — не абстрактнае паняцце, — уступае ў размову Святлана Семянчук, камсорг 5-й групы. — Мне не хочацца гаварыць збітых фраз, але, гаворачы пра нашу Святлану, без прыгожых слоў, напэўна, не абыйдзешся. Таму што яна заўсёды гатова дапамагчы—парадай, справай. Вясёлая, яна стварае ў калектыве асаблівую атмасферу. Ды што доўга гаварыць? Малайчына наша Света!

А яна ўжо закончыла работу і з адкрытай усмешкай, якая яе так упрыгожвае, падышла да мяне.

— Света, некалькі слоў пра сябе, калі ласка. Мне расказалі, што ты вельмі цікавы чалавек.

Святлана смяецца:

— Калі казаць праўду, актывістка я з 1-га класа: у школе мяне адразу ж выбралі камандзірам акцябрацкай зорачкі. Потым была членам савета атрада, дружыны, старшынёй савета дружыны. Як толькі споўнілася 14 гадоў, уступіла ў камсамол, а праз некаторы час была выбрана сакратаром камітэта камсамола нашай школы.

А ў 8-м класе мяне выбралі дэлегатам на XXVI з'езд ЛКСМБ. Гэта было поўнай нечаканасцю. Школьніца, амаль дзяўчо, аказалася на такім прадстаўнічым з'ездзе! Было страшна і радасна. Страшна, таму што была адным з самых маладых дэлегатаў. Радасна, таму што адчувала сваё дачыненне да ўсяго, што адбывалася. Незабыўнае ўражанне пакінуў з'езд...

Закончыўшы школу з залатым медалём, Святлана паступіла ва універсітэт на хімічны факультэт.

— Хімію любіла даўно, займалася ў школе юнага хіміка. І хацела стаць педагогам. Вось вучуся... І мару хутчэй прыйсці ў школу.

— А як склаўся камсамольскі лёс у БДУ?

— На I курсе мяне выбралі камсоргам групы, на справаздачнай канферэнцыі — членам камітэта камсамола БДУ. А на адным з пленумаў — намеснікам сакратара камітэта камсамола БДУ па вучэбна-выхаваўчай рабоце. Гэта вельмі цяжкі аддзел, і работа ў ім адбірае шмат часу. Але ж ужо даўно даказана: чым больш чалавек заняты, тым больш ён паспявае. Я сама здзіўляюся часам, як можна ўсё паспець. Напэўна, так атрымліваецца таму, што я люблю камсамольскую работу.

— Света, ты гаварыла пра цяжкасці. У чым яны?

— Справа ў тым, што перш за ўсё мне самой бывае цяжка зразумець студэнтаў, якія, паступіўшы ў БДУ, фактычна толькі лічацца студэнтамі, зусім не працуюць. Я проста жахнулася, убачыўшы, колькі на некаторых факультэтах «хвасцістаў». Наша галоўная задача — павысіць якасць падрыхтоўкі спецыялістаў. Зараз вядзецца падрыхтоўка да злёту выдатнікаў. Плануем на некаторых факультэтах правесці грамадскі агляд ведаў. У час яго грамадскія камісіі, якія складаюцца са студэнтаў-выдатнікаў і старшакурснікаў, ацэняць веды сваіх таварышаў. Будзе своеасаблівы экзамен па прафіліруючых прадметах. Мне здаецца, гэта вельмі карыснае пачынанне.

Я цалкам згодна са Святланай. Такая праверка дапаможа даведацца пра свае сілы тым, хто губляецца перад строгімі экзаменатарамі, і прымусіць задумацца тых, хто занадта ўпэўнены ў сабе. Агляды дапамогуць і ў падрыхтоўцы да сесіі.

Я слухала Свету і думала, як можна ўсё паспяваць — выдатна вучыцца, весці вялікую грамадскую работу. Света паспявае. І паспявае не толькі вучыцца і працаваць. Для тэатра і паэзіі — галоўнага свайго захаплення — яна таксама знаходзіць час.

— Вельмі люблю Беларускі тэатр. І беларускую паэзію. Не ўяўляю сваё жыццё без цудоўных, поўных музыкі вершаў М. Багдановіча. Ён — мой любімы класік. Яшчэ вельмі люблю шыць,— дадае Света з усмешкай.

...Праз тыдзень у Мінску пачне сваю работу XXVII з'езд ЛКСМБ. Сярод яго дэлегатаў будзе і Святлана Канаш.

— З'езд чакаю з нецярплівасцю,— гаворыць яна.— За гады, якія мінулі з часу папярэдняга з'езда, у камсамольскіх арганізацыях рэспублікі зроблена вельмі многа. З'езду належыць ацаніць праведзеную работу. Думаю, што дэлегаты пачуюць не толькі справаздачы і рапарты, але і глыбокі аналіз праблем.

Я пажадала дзяўчыну, пажадала ёй шчасця і поспехаў у яе нялёгкай працы. І Святлана Канаш зноў вярнулася да сваёй установкі. Студэнтка-другакурсніца. Дэлегат XXVII з'езда ЛКСМБ. Кандыдат у члены КПСС. Будучы выкладчык хіміі.

**Ю. ГУРТОЎЦАВА,**
**наш кар.**

**НА ЗДЫМКУ: дэлегат XXVII з'езда ЛКСМБ Святлана Канаш.**
**Фота В. Шачака.**





● БДУ — НАРОДНАЙ ГАСПАДАРЦЫ

# ПРА ШТО РАСКАЗАЛІ АНКЕТЫ

«...Ці падабаецца вам ваша прафесія?», «Што больш за ўсё прыцягвае вас у грамадскай рабоце?», «Ці задавальняюць вас узаемаадносіны з таварышамі па працы?» На гэтыя і яшчэ шматлікія пытанні адказвалі нядаўна рабочыя Мінскага вытворчага тонкасуконнага аб'яднання, сярод якіх былі распаўсюджаны спецыяльныя анкеты. Справа ў тым, што на прадпрыемстве сваёй сацыялагічнай службы няма. А неабходнасць даследавання атмасферы ў калектыве, адносін людзей да працы, да выбранай прафесіі, грамадскай дзейнасці даўно наспела. Іменна таму кіраўніцтва прадпрыемства разам з партыйнай і прафсаюзнай арганізацыямі звярнулася за дапамогай у сектар прыкладной сацыялогіі БДУ імя У. І. Леніна.

Калектыў сектара, які створаны пры кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў, назапасіў ужо нямала вопыту ў такой рабоце. Даследаванні, праведзеныя яго работнікамі на камвольным камбінаце, маторным заводзе, станкабудаўнічым імя С. М. Кірава і іншых прадпрыемствах беларускай сталіцы, далі шмат карыснага для стварэння больш здаровага маральна-псіхалагічнага клімату ў калектывах.

Амаль год працавалі сацыёлагі і на тонкасуконным аб'яднанні. Каля пяцісот чалавек апыталі яны з дапамогай некалькіх анкет і ў выніку атрымалі даволі шчырыя адказы (яны былі ананімныя) на пытанні, якія цікавяць.

Пра што ж расказалі анкеты? Большасць рабочых задаволены сваёй прафесіяй, умовамі працы, створанымі на прадпрыемстве. Задавальняюць іх і таварыскія, дзелавыя ўзаемаадносіны ў калектыве. Нямала было названа ў анкетах імён людзей, якім давяраюць, на якіх раўняюцца.

Аднак было нямала і думак, над якімі патрэбна задумацца адміністрацыі аб'яднання. Выказвалася, у прыватнасці, думка аб неабходнасці павышэння прэстыжнасці прафесій прадзільшчыка і ткача. У шэрагу анкет даваліся нізкія ацэнкі рабоце грамадскіх арганізацый прадзільнай і ткацкай вытворчасці, гаварылася пра слабую інфармаванасць рабочых, пра няўвагу да многіх іх заўваг і прапаноў. Нездавальняючую ацэнку члены калектыву далі пастаноўцы на прадпрыемстве культурна-масавай і спартыўнай работы, выказвалі незадавальненне па прычыне слабай асветленасці цэхаў, асабліва ў начны час.

— Нельга сказаць, што ўсе гэтыя заўвагі былі для нас адкрыццем,—гаворыць начальнік лабараторыі навуковай арганізацыі працы аб'яднання Валянціна Георгіеўна Рагачова.— Пра некаторыя недахопы мы ведалі, аднак работа па іх ліквідацыі вялася несістэматычна, ад выпадку да выпадчу. Зараз дзякуючы сацыёлагам, работай якіх мы, дарэчы, вельмі задаволены, кіраўніцтва аб'яднання мае канцэнтраваны аналіз нашай сацыяльнай дзейнасці. Гэта дазволіць нам на падставе прапанаваных мерапрыемстваў скласці канкрэтны план дзеянняў, назваць асоб, адказных за ліквідаванне тых або іншых недахопаў, і павесці работу мэтанакіравана. Бо зараз пры наяўнасці цудоўных вытворчых плошчаў, дастаткова дасканалай тэхнічнай базы стварэнне нармальнага сацыяльна-псіхалагічнага клімату ў калектыве ставіцца ледзь не на першы план. Увага да канкрэтнага чалавека — вось у ідэале тое, да чаго мы павінны імкнуцца.

Дапамагчы гэтаму і заклікана тая работа, якую праводзяць у аб'яднанні сацыёлагі. Праграма яе разлічана на тры гады. Ужо зараз на прадпрыемстве з дапамогай сацыёлагаў праводзяцца рабочыя сходы. Ставіцца задача — дабіцца іх максімальнай эфектыўнасці, давесці іх рашэнні непасрэдна да адрасата. Шмат карыснага даюць індывідуальныя гутаркі з майстрамі і іх памочнікамі. Паведамляючы ім аб думцы калектыву, сацыёлагі міжволі прымушаюць людзей задумацца над сваімі промахамі, перагледзець нейкія пазіцыі ва ўзаемаадносінах з падначаленымі. Супрацоўнікі сектара выступаюць на занятках школ перадавога вопыту, дапамагаюць у правядзенні традыцыйнага дня майстра, гутараць з маладымі рабочымі, даследуюць прычыны спазнення на работу...

Сацыёлагі актыўна ўмешваюцца ў жыццё калектыву. І гэта дае станоўчыя вынікі.

**І. ПАЎЛАВА.**



**НА ЗДЫМКАХ: у сектары прыкладной сацыялогіі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна; сацыёлаг К. Г. Лапіч праводзіць даследаванне ў Мінскім вытворчым тонкасуконным аб'яднанні.**

Фота **В. Шачака.**

● З НАШАЙ ПОШТЫ

# З ДОБРЫМ НАСТРОЕМ

**ПАСЛЯ зімовай студэнцкай сесіі прайшоў месяц. За плячыма бяссонныя ночы, экзаменацыйныя білеты, адказы. І кожны студэнт вяртаецца да гэтых напружаных дзён сесіі, успамінае тое, што больш памятным засталося ад усяго перажытага. Заходзячы ў адну з аўдыторый філалагічнага факультэта, дзе рыхтуюцца да чарговай лекцыі студэнты другога курса, адразу па радасных тварах юнакоў і дзяўчат можна здагадацца, хто з іх здаў сесію на выдатна, каму было цяжкавата, а хто і ў адчаі.**

**У Васіля Вашчанчука, як і ва ўсіх другакурснікаў, за плячыма тры сесіі. І ў заліковай кніжцы гэтага студэнта адны выдатныя адзнакі.**

**Бывала, прачнецца Васіль раней звычайнага, хуценька падхопіцца, зробіць некалькі гімнастычных практыкаванняў — і на факультэт...**

**— Ты чаго так рана? — пачуецца за спіной голас аднакурсніка. — Можа, новае жыццё пачынаеш!**

**— Якое яшчэ новае! Справы, разумееш, грамадскія справы, — адказвае Васіль.**

**І сапраўды, спраў у Васіля Вашчанчука шмат. Ён з'яўляецца членам камітэта камсамола факультэта, дзе нясе адказнасць за штаб працоўных спраў.**

**На першым курсе ездзіў упершыню байцом будаўнічага атрада «Буравеснік» у Пскоўскую вобласць. Працаваў з агеньчыкам, дбайна і сур'ёзна. А сёлета яго выбралі камісарам гэтага атрада. І летнія працоўныя будні цяпер будуць праходзіць у Карэліі.**

**— Любіць працу, цэніць па сапраўднаму сяброўства, у цяжкую хвіліну падтрымае таварыша і справай і словам, — гаворыць пра В. Вашчанчука яго аднакурснік Леанід Трубач.**

**З добрым настроем пачалі новы семестр і студэнты Сяргей Кавалёў, Вікторыя Каўхута, Вольга Хвошч, Валянціна Бесава, Надзея Волчык і многія іншыя. Усе яны — выдатнікі вучобы, актывісты камсамольскіх спраў, добрыя сябры.**

**С. ЧЫГРЫН,**
**студэнт філфака.**

## ПАЗЫЎНЫЯ ТРЭЦЯГА ПРАЦОЎНАГА

### Раўненне на героя

ПРАЦОЎНАЕ выхаванне моладзі мае вельмі важнае значэнне. Штогод сотні тысяч студэнтаў арганізуюць будаўнічыя атрады і едуць туды, дзе іх умелыя рукі і гарачыя сэрцы патрэбны больш за ўсё.

Наш атрад «Ветразь» — навічок у студэнцкім будаўнічым руху. Ганаровым байцом мы выбралі нашага земляка — Героя Савецкага Саюза Пятра Купрыянава. Для таго, каб больш даведацца пра героя, мы пабывалі на яго радзіме, у г. Жодзіна, наведалі дом-музей, у якім у 1947—1969 гг. жыла яго маці. Манумент маці-патрыётцы і яе сынам-героям сваёй веліччу ўразіў нас. У журботным маўчанні застыла маці, праводзячы ў бой пяцярых сыноў. Ні адзін з іх не вярнуўся ў бацькоўскі дом. Самы малодшы, азірнуўшыся, глядзіць на маці...

Ён загінуў 2 лістапада 1944 года ў баі ля хутара Ліздзелда Сфундскага раёна Латвійскай ССР, закрыўшы сваім целам амбразуру дзота. Пасмяротна Пятру Купрыянаву было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Людзі не забылі герояў, якія аддалі сваё жыццё за іх.

На сходзе атрада мы аднадушна вырашылі частку заробленых грошай пералічыць у Фонд міру, бо Пётр Купрыянаў і мільёны савецкіх людзей загінулі за тое, каб ніколі не было вайны, за мір на ўсёй зямлі.

**А. ЛЮТАРЭВІЧ,**
**камандзір.**
**Р. ЗАЛЕСКАЯ,**
**камісар**
**СБА «Ветразь».**

### Ідэя рэалізуецца

**З ПРЫАДЧЫНЕНЫХ дзвярэй чуюцца дзіцячыя галасы, зрэдку раздаецца смех. Але няма ў ім тых шчаслівых, бесклапотных нотак, якія ўласцівы дзецям такога ўзросту. Мы — у дзіцячым доме № 2. Утульныя пакоі, цацкі не могуць замяніць малым недахоп матчынай пяшчоты.**

**— Работы ў нас шмат,—гаворыць дырэктар**

**Рашэнне прыходзіць адразу. Дзеці ад 3 да 8 гадоў, якія пазбаўлены бацькоўскай цеплыні, маюць патрэбу ў камсамольскім клопаце. Студэнты механіка-матэматычнага факультэта БДУ аб'явілі аб наборы ў камуністычны педатрад, які будзе працаваць летам у дзіцячым доме. Як правіла, фарміраваць атрады, якія застаюцца ў Мінску, заўсёды цяжэй, чым тыя, якія выязджаюць за яго межы. Гэта лёгка тлумачыцца тым, што кожны з нас імкнецца ў час канікулаў як мага больш убачыць незнаёмых месц, цягне рамантыка падарожжаў, а часта проста хочацца адпачыць ад гарадской мітусні і клопатаў недзе ў вясковай мясцовасці. Таму ідэя стварэння нашага атрада сустрэла некаторыя сумненні.**

**Пачынаць заўсёды цяжка. Да таго ж работа ў дзіцячым доме патрабуе асаблівых якасцей. Але ўсе сумненні развеяліся адразу. Вынікі фарміравання атрада пераўзышлі ўсе нашы чаканні. Конкурс быў нават большы, чым у многія выязныя СБА. На субяседаванні пры залічэнні кандыдатам у байцы перавага аддавалася студэнтам педпатокаў.**

**Фарміраванне атрада закончана. Пачынаецца падрыхтоўчы перыяд. Наперадзе ў байцоў СБА шмат цікавых спраў, будуць і цяжкасці. Але пераадольваць іх значна лягчэй, калі ведаеш, што не толькі твая работа, але і тваё душэўныя якасці вельмі патрэбны дзецям.**

**А. ЛІПА,**
**камандзір камуністычнага студэнцкага атрада, студэнтка III курса механіка-матэматычнага факультэта.**

### Імкнёмся стаць правафланговымі

НА ФАКУЛЬТЭЦЕ прыкладной матэматыкі сфарміравана 14 студэнцкіх атрадаў. У гэтым годзе нарадзіўся і наш атрад імя 60-годдзя БДУ. Сфарміраваўся ён на базе камсамольскай арганізацыі кафедры вылічальнай матэматыкі. Мы, байцы гэтага атрада, з усёй адказнасцю ставімся да выканання сваіх абавязкаў у падрыхтоўчы перыяд і пастараемся апраўдаць ганаровае сваё званне.

Сур'ёзна і з захапленнем адносяцца да сваёй работы члены рэдкалегіі Т. Гульнік і Т. Кравец: яны афармілі святочны стэнд да Міжнароднага жаночага дня і стэнд ганаровага байца. Сіламі атраднай агітбрыгады быў арганізаваны канцэрт для вучняў Мінскай школы № 19.

Вельмі цікавай была сустрэча з ганаровым байцом атрада Героем Савецкага Саюза А. Р. Мазанік, якая расказала пра беларускае падполле, пра сваю падпольную дзейнасць, пра жахі вайны, мужнасць і непахісную волю савецкага народа, сапраўдных сыноў і дачок нашай Радзімы.

Плённа працуе і лектарская група нашага атрада. Словам, мы прыкладзём усе намаганні для таго, каб стаць правафланговымі.

**В. ШЧАСНОВІЧ,**
**камандзір СБА**
**імя 60-годдзя БДУ**
**імя У. І. Леніна.**

# МЭТА — АГУЛЬНАЯ

ПРАЦОЎНЫ дзень пакуль не пачаўся. Але кабінет начальніка гаража ўжо адкрыты. Міхаіл Пятровіч Шчарбакоў, яго гаспадар, як заўсёды, прыйшоў раней. На стале пакуль маўчыць тэлефон. Міхаіл Пятровіч ужо ўвесь у справе...

Пытаюся, як удаецца такому параўнальна невялікаму калектыву, якім ён кіруе, абслугоўваць транспартам шматтысячны універсітэт?

— У нашым гаражы 28 адзінак аўтамабіляў, аўтобусаў. Безумоўна, бываюць і цяжкасці,— гаворыць М. П. Шчарбакоў, — але мы заўсёды шукаем выйсце. І, на мой погляд, нам гэта ўдаецца. Цяжкасці мы пераадольваем за кошт таго, што калектыў у нас дружны і зладжаны. Адзін аднаго разумеем з паўслова.

Калі я папрасіў расказаць пра лепшых людзей, то Міхаіл Пятровіч адразу назваў Мікалая Мікалаевіча Раманава, шафёра аўтобуса. І зрабіў агаворку: горшых у нас няма, так што прыйдзецца гаварыць пра ўсіх.

— Мікалай Мікалаевіч Раманаў — гэта старэйшы работнік гаража. Трыццаць гадоў ён працуе тут. На вачах яго рос і развіваўся універсітэт. Паважаны чалавек, ён служыць прыкладам для ўсіх, да яго ідуць за парадай, на яго раўняюцца.

Васіль Сцяпанавіч Казлоў — дванаццаць гадоў у гаражы. Як і Мікалай Мікалаевіч, ён водзіць аўтобус. Усе найлепшыя словы, якія можна сказаць пра выдатнага чалавека і руплівага працаўніка, будуць характарыстыкай Васілю Сцяпанавічу Казлову,— заключае М. П. Шчарбакоў.

Яшчэ даведаўся, што В. С. Казлоў вядзе вялікую грамадскую работу. Ён член мясцкома БДУ імя У. І. Леніна.

Добрым майстрам сваёй справы лічыцца ў гаражы Аляксандр Пятровіч Графаў. Толькі другі год тут працуе, а ў калектыве да яго адносяцца з павагай. Любую даручаную справу выконвае з поўнай адказнасцю і сумленна.

Сапраўды, амаль пра кожнага члена гэтага калектыву можна сказаць самыя добрыя і удзячныя словы. Здараецца, напрыклад, што працоўны дзень заканчваецца, а тут паступіла тэрміновая заяўка перавезці груз. Неабходна аўтамашына. І шафёр згаджаецца працаваць пасля рабочага дня.

Цяжка расказаць пра ўвесь аб'ём работы, які выконвае гараж. Практычна кожная кафедра і падраздзяленне універсітэта карыстаецца паслугамі транспартнікаў, не гаворачы ўжо пра перавозкі студэнтаў. Летам, калі універсітэт крыху заціхае, у работнікаў гаража спраў менш не становіцца. У падшэфны Уздзенскі раён Мінскай вобласці накіроўваюцца на дапамогу грузавыя аўтамабілі. Летась там іх працавала чатыры. У адрас начальніка гаража ішлі падзякі з падшэфнага раёна за добрасумленную працу шафёраў.

Работнікі гаража працаваць умеюць і любяць сваю працу. Аднак ці заўсёды клопатам важнага падраздзялення ўдзяляецца належная ўвага? Гэта ў першую чаргу датычыцца заказчыкаў. Нясвоечасовая падача заявак тармозіць работу гаража і, канешне, церпяць непрыемнасці самі заказчыкі. Прытым заяўкі афармляюцца не заўсёды правільна. Міхаіл Пятровіч паказвае мне чысты бланк для заявы. Усё, здаецца, прадугледжана тут. Ды вось не ўсе ўпішуць, які груз трэба прывезці, на які час неабходна машына. Ды наогул дату і то, бывае, не паставяць. Вось і думай потым кіраўніцтву гаража над гэтай гора-заявай. Здараецца і такое, што машыны затрымліваюць, а тут кожная хвіліна на ўліку. Парушаецца рытм работы. Дарэчы, кіраўніцтва гаража праводзіць сумяшчэнне заявак у мэтах рацыянальнага выкарыстання аўтамашын. Аднатыпныя заяўкі выконвае адзін шафёр.

Ёсць праблема і з недахопам кадраў. Перад маёй размовай з начальнікам гаража прыходзілі нарэшце уладкавання на работу двое маладых людзей. Але ў хуткім часе ўсе пайшлі. Ці вернуцца — невядома.

Існуе дэфіцыт у запчастках, у памяшканнях. Пяць машын стаіць пад адкрытым небам. Праўда, работнікам гаража за апошні час удалося крыху выправіць становішча, ды і будуецца ўжо новая майстэрня. Умовы працы паляпшаюцца.

Працавіты і зладжаны калектыў гаража пераадольвае цяжкасці. І ў гэтай справе ён мае падтрымку з боку рэктарата, бо мэта па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў ва ўсіх агульная. І рашаць яе патрэбна ўсім звенням універсітэта сумесна.

**І. ПАПКО,**
**наш кар.**



# СЭКАНОМІЛІ НА ЗОЛАЦЕ

ДЗЕ ЗНАЙСЦІ «лішняе» золата? Адказ на гэтае пытанне падказалі спецыялістам Мінскага гадзіннікавага завода вучоныя БДУ імя І. У. Леніна. Яны прапанавалі прадпрыемству новы метад вызначэння канцэнтрацыі высакароднага металу ў электраліце, які прымяняецца для пазалоты гадзіннікаў. Кантроль, на які ідзе толькі некалькі мінут, заменіць традыцыйныя дзесяцігадзінныя аналізы і дасць магчымасць эканомна расходаваць золата.

Справа ў тым, што тэхналогіяй дапускаюцца невялікія адхіленні яго колькасці ў растворы. Працаваць з менш насычаным электралітам зручней—эканоміцца метал, але ёсць небяспека, што яго проба будзе ніжэй той, што дапускаецца. Прыкмеціць жа гэта своечасова і папярэдзіць брак немагчыма. Таму работнікі вытворчасці аддавалі перавагу больш насычанаму электраліту.

Сёння навінка працуе на некалькіх прадпрыемствах, дзе прыносіць ад 50 да 100 тысяч рублёў гадавой эканоміі. Падобныя кантралюючыя сістэмы вучоныя распрацавалі і для серабра, а зараз вядуць эксперыменты з азотам. Узброеныя новай вымяральнай тэхнікай, аграномы змогуць хутка і дакладна вызначыць працэнтную наяўнасць у глебе гэтага важнага кампанента ўгнаенняў.

**Д. ПАТЫКА.**



**У студэнцкім кафэ «Гаўдэамус».** Фота **В. Шачака.**



# АМАТАРЫ...

ЛЮБІЦЬ апантана адпачываць Іосіф Гардынец. Вельмі любіць. Хаця вучоба на геаграфічным факультэце некалькі і перашкаджае гэтаму. Шмат часу забірае ад любімай справы. Але калі ўжо дарвецца да адпачынку — толькі трымайся. Адпачывае аж да памутнення ў вачах. І ніхто ў гэтым яму не перашкаджай. Ніхто. Ён сам сабе гаспадар. Пажадае — ляжыць на ложку. Пажадае — загляне ў суседскі пакой. І замок яму не перашкода. А калі надакучыць быць аднаму — падаецца да сябрука, таксама студэнта геафака Аляксандра Казьміна. Разам адпачываюць апантана. Двайм весялей. Неяк сябрукі так наадпачываліся, што вымушаны быў прыйсці камендант інтэрната № 5 з прадстаўнікамі грамадскасці, каб іх крыху супакоіць. Але Іосіфу і Аляксандру і камендант, і грамадскасць — не ўказ. Зашчоўкнулі замок. І ўсё! Не перашкаджайце. У іх свая справа — адпачынак...

А вось у інтэрнаце № 6 маецца другі «від» аматараў. Прыбіраць пакоі? Не, гэта не іх занятак. Ніякага інтэлектуальнага зараду не дае. Таварышы па пакоі павінны гэта рабіць. А яны ў гэты час будуць назіраць за правільнасцю тэхналогіі ўборкі. Дадуць параду, пад якім вуглом трымаць венік і як больш эфектыўна пырскаць вадой... Аляксандр Кадан, Павел Канстанцінаў, Часлаў Кірвель, Уладзімір Каранчук — прадстаўнікі гэтага «віду» аматараў, а па сумяшчальніцтву — студэнты ФПМ. Яны нават графік уборкі ў пакоях склалі толькі для сваіх таварышаў. Вось так!

Пазнаёміўшыся з гэтымі заўзятымі аматарамі, хочацца спытаць у камітэтаў камсамола ФПМ і геафака іх пункт гледжання на захапленні студэнтаў.

**В. АРЭШАК.**

# АДПОР МАЕ ПРАВА ДАЦЬ КОЖНЫ

**НАША ЮРЫДЫЧНАЯ КАНСУЛЬТАЦЫЯ**

**РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ» АДНАЎЛЯЕ ПУБЛІКАЦЫЮ АРТЫКУЛАЎ ПА ПЫТАННЯХ ПРАВА І ЗВЯРТАЕЦЦА ДА СТУДЭНТАЎ ЮРЫДЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА (ЧЛЕНАЎ НАВУКОВЫХ ГУРТКОЎ, ДЫПЛОМНІКАЎ) З ПРАПАНОВАЙ РЫХТАВАЦЬ АРТЫКУЛЫ ДЛЯ ШМАТТЫРАЖНАЙ ГАЗЕТЫ ПА ПЫТАННЯХ, ЯКІЯ ЦІКАВЯЦЬ СУПРАЦОЎНІКАЎ І СТУДЭНТАЎ НЕЮРЫДЫЧНЫХ ФАКУЛЬТЭТАЎ.**

**КІРАЎНІЦТВА ЮРЫДЫЧНАЙ КАНСУЛЬТАЦЫЯЙ У ГАЗЕЦЕ ВЯДЗЕ ЗАГАДЧЫК КАФЕДРЫ КРЫМІНАЛЬНАГА ПРАВА ПРАФЕСАР І. С. ЦІШКЕВІЧ.**

Мішэнін і яго сабутэльнік Шаркоў а першай гадзіне ночы бадзяліся па вуліцах, гарлапанілі, прыставалі да прахожых. Спыніўшыся каля незнаёмага дома, пачалі раз'юшана стукаць у дзверы і вокны. Іванаеў, гаспадар гэтага дома, яго жонка і дзеці прасілі хуліганаў пайсці. Але тыя сталі пагражаць, што ўварвуцца ў дом і «ўсіх перарэжуць», пачалі кідаць цагліны, выбілі шкло і палезлі ў кватэру. Іванаеў папярэдзіў, што будзе страляць. Пагрозы на хуліганаў не падзейнічалі. Тады Іванаеў з паляўнічай стрэльбы зрабіў два папярэдзіця стрэлы. І гэта не спыніла злачынцаў. Іванаеў, абараняючы сябе і сям'ю, выстраліў у Мішэніна і цяжка параніў яго. Дзеянні Іванаева былі прызнаны правамернымі.

Згодна з артыкулам 13 Крымінальнага Кодэкса БССР, «не з'яўляецца злачынным дзеянне, хоць і падпадаючае пад прыкметы дзеяння, прадугледжанага дзеючым Кодэксам, але якое здзейснена ў стане неабходнай абароны, гэта значыць пры абароне інтарэсаў Савецкай дзяржавы, грамадскіх інтарэсаў, асобы ці правоў таго, хто абараняецца, ці іншай асобы ад грамадска небяспечнага замаху шляхам нанясення таму, хто замахваецца, шкоды, калі пры гэтым не было допушчана перавышэнне межаў неабходнай абароны.

Перавышэннем межаў неабходнай абароны прызнаецца яўная неадпаведнасць абароны характару і небяспечнасці замаху».

Кожны грамадзянін мае права абараняць ад грамадска небяспечнага замаху не толькі сябе, але і дзяржаўныя, грамадскія інтарэсы, а таксама інтарэсы іншых асоб.

Неабходная абарона магчыма не ад любога замаху, а толькі ад грамадска небяспечнага, напрыклад, ад замаху на забойства, разбою, згвалтавання, нанясення цялесных пашкоджанняў, хуліганства. Не ўзнікае права на неабходную абарону пры здзяйсненні малазначных правапарушэнняў, якія не з'яўляюцца злачынствам. Не допускаецца таксама неабходная абарона супраць законных дзеянняў службовых асоб. Не мае права, напрыклад, абараняцца злачынца ад дзеянняў прадстаўніка ўлады або іншага грамадзяніна, якія затрымліваюць яго.

Наступнай умовай допушчальнасці неабходнай абароны з'яўляецца яе своечасовасць. Абарона допускаецца не толькі тады, калі нападзенне ўжо пачалося, але і ў выпадку рэальнай пагрозы нападзення, калі яно непасрэдна будзе (вось-вось пачнецца), і таму марудзіць з абаронай нельга.

Пацярпеўшы мае права абараняцца, калі нават у яго ёсць магчымасць выратавацца бегствам, звярнуцца за дапамогай да органаў улады, да іншых грамадзян. Зварот за дапамогай мэтазгодны, але гэта права, а не абавязак таго, хто абараняецца.

Права на неабходную абарону спыняецца з моманту заканчэння замаху. Але калі нападзенне прыпынена толькі на тэрмін і ёсць рэальная пагроза яго працягу, абарона можа быць прадоўжана. Прызнаецца своечасовай і абарона ў тых выпадках, калі для таго, хто абараняецца, не быў ясным момант заканчэння нападзення.

Важнай умовай правамернасці неабходнай абароны з'яўляецца адсутнасць яўнай неадпаведнасці абароны характару і небяспечнасці замаху. Абарона не можа быць зведзена да пасіўнага процідзеяння, да парыравання ўдараў таго, хто нападае, яна можа насіць актыўны характар, але павінна здзяйсняцца ў межах неабходнасці.

Не допускаецца акт помсты — самачыннай расправы. Самасуд над злачынцам цягне да крымінальнай адказнасці на агульных падставах.

Для тых, хто жадае больш падрабязна азнаёміцца з гэтым пытаннем, рэкамендуюцца наступныя кнігі: І. С. Цішкевіч. Абарона ад нападзення злачынцы. Мн., 1972; яго ж: Барацьба са злачыннасцю—справа кожнага. М., 1981; Н. Н. Сакалоў, І. Г. Чупаленкаў. На чыім баку закон. М., 1981.

**В. ЗАБАРОНАК,**
**студэнт IV курса юрфака, член навуковага гуртка.**

СУСТРЭЧЫ ДЛЯ ВАС

# УЛЮБЁНЫ Ў СЛОВА

НА СЯРЭДЗІНУ ярка асветленай студыі, дзе стаяў прысадзісты журнальны столік з кветкамі і высокі мікрафон, шырокім крокам прайшоў сярэдняга росту чалавек. Кашуля з наўмысна расшпіленым каўняром, каштанавыя пасярэбраныя валасы, стомлены твар — вось, бадай, і ўсё, што адразу кінулася ў вочы.

Чатыры кінакамеры суправаджалі яго ад самых дзвярэй. Зала апладзіравала. А ён паклаў на край століка кнігу, паправіў мікрафон і зусім будзённа прамовіў:

— Добры дзень. Гэты паэтычны вечар на гасціннай беларускай зямлі я хачу пачаць сваім вершам, які называецца «Рэквіем».

Так для многіх з тых, хто знаходзіўся ў зале, адбылося знаёмства з паэтам Андрэем Вазнясенскім.

Пра Вазнясенскага пісалі, што ён не ўвайшоў, а ўварваўся ў паэзію, міма кніжных паліц, адразу выходзячы на эстраду. Дваццаць гадоў назад гэтую смеласць часта называлі саманадзейнасцю. На самай справе энергіі і энтузіязму, з якімі яго паэзія ахоплівае жыццё, нельга не здзіўляцца і не пазайздросціць. З якім аптымізмам ён сцвярджае жыццё!

У лепшых вершах Вазнясенскага чаруе сплаў думкі і пачуцця, яркая, дзёрзкая вобразнасць, уражвае шматбаковасць інтарэсаў яго лірычнага героя. І самае каштоўнае ў паэта — шчырасць:

Влюбленный в слово,
все, что я хочу,—
сложить такое
словосочетанье,
какое неподвластно
попаданью
ни авиа, ни просто палачу!

Пра яго шмат спрачаюцца. Але ўсе згаджаюцца ў адным:

Вазнясенскі — паэт сучасны. Сучасны перш за ўсё па духу, па адчуванню нашага часу, па складу мыслення. Пра што б ні гаварыў ён на гэтым вечары— пра сустрэчы з Пабла Пікасо, пра апошнюю паездку па Мексіцы, пра пастаноўкі тэатра імя Ленінскага камсамола,— уражвае глыбіня яго меркаванняў, бескампраміснасць у асэнсаванні і ацэнцы фактаў.

Пасля заканчэння вечара да Вазнясенскага было не падысці. Ён раздаваў аўтографы, адказваў на пытанні, развітваючыся, паціскаў рукі. Сустрэцца з ім давялося толькі ў гасцініцы, у яго нумары, дзе і адбылася размова:

**— Скажыце, Андрэй Андрэевіч, ці існуе такі час у гісторыі, калі паэт найбольшым чынам уплывае на людзей?**

— Хацелася б адказаць нейк адным сказам, але нічога не атрымаецца. Канешне, увесь чалавечы вопыт паказвае, што паэтычнае слова з найбольшай сілай уплывае на сучаснікаў у пераломныя моманты гісторыі. Успомнім хаця б пачатак нашага веку. Колькі адразу яркіх імён прыйшло ў паэзію! Але, канешне, калі абвастраецца лірычнае ўспрыманне свету, то не ў адной гісторыі ўся справа. Услухайцеся ў радкі, якія запомніліся. Яны будуць гучаць ва ўнісон вашым пачуццям, думкам, настрою, які вы разгадалі ў аўтара. Таму я хачу дадаць, што, акрамя імгнення ў гісторыі, патрэбна чакаць і той час, калі людзі стануць, змогуць чула слухаць адзін аднаго.

**— Ці не хочацца Вам нешта змяніць, перапісаць нанава са сваіх ранейшых вершаў?**

— Змяніць? Не. Вершы былі напісаны, былі напісаны шчыра. Змяніць у іх нешта — гэта ўжо значыць здрадзіць самому сабе, мінуламу. Канешне, нейкія з іх падабаюцца мне, нейкія цяпер ужо не вельмі — мы ж мяняемся. Адно і тое ж з часам можна асэнсаваць па-рознаму. Але змяняць створанае нельга. Кожны паэт у сваёй творчасці падуладны закону эвалюцыі. Дзейнічаць супраць гэтага закона — будзе несумленна.

**— Зараз некаторыя паэты пішуць прозу. Ці няма ў Вас жадання паспрабаваць сябе на гэтым полі дзейнасці?**

— Пакуль што не. Хацелася б адразу агаварыцца, што часам у адным «празаічным» месцы пісьменніка можна адкрыць больш паэзіі, чым у іншых шэрых, зарыфмаваных працах, якія чамусьці называюцца вершамі. У маім апошнім зборніку «Безотчётное» нямала так званых «белых» вершаў. І напэўна цяжка вызначыць водавочную розніцу між імі і прозай.

**— Каго Вы маглі б назваць з маладых паэтаў як найбольш яркіх?**

— Наогул зараз такі час, калі вось-вось павінен нехта «ўспыхнуць». З тых, хто ўжо вядомы чытачам, я вызначыў бы Аляксандра Ткачэнку з Сімферопаля і кіяўляніна Андрэя Чарнова.

**— Якое ўражанне засталося ў Вас ад сустрэч з мінчанамі?**

— Самае добрае. І не толькі таму, што мяне ўсюды цёпла сустракалі. Ведаеце, гэта ж не заўсёды важна: апладзіруе зала ці не. Важна іншае, тое, пра што пытаюцца, чым цікавяцца тыя, хто сядзіць у гэтай зале. А калі атрымліваеш запіску, дзе пытаюцца, ці жанаты Раймонд Паулс, ці ёсць муж у Алы Пугачовай, то здзіўляе: няўжо гэта і ўсё, што хвалюе таго, хто даслаў такое пытанне?

У Мінску, у залах і студыях, дзе мне давялося выступаць, пытанняў такога тыпу не было. Творчая размова адбылася на самым высокім узроўні.

**В. ЧАРНЯЎСКІ,**
**слухач падрыхтоўчага аддзялення.**

**На памяць аб гутарцы А. Вазнясенскі даў аўтограф, дзе напісаў:**

В первый день весны —
уезжаю с [illegible] Минска —
поэта, дерзкого, искателя!
Андрей Вознесенский 19-82

СПОРТ

# ЗАХАПЛЯЮЧЫЯ СТАРТЫ

**АДБЫЛІСЯ НА ПЕРШЫНСТВЕ УНІВЕРСІТЭТА ПА ЛЫЖАХ**



САМЫ ЦІКАВЫ момант у спаборніцтвах па лыжах — эстафеты. Тут праяўляецца ўсё майстэрства спартсменаў, іх характар. У гонках удзельнічала каля 150 студэнтаў. А ў эстафетах выступаюць толькі лепшыя. Па гэтых стартах можна меркаваць аб падрыхтоўцы каманд у цэлым.

Перад эстафетамі хваляваліся не толькі спартсмены. Трэнеры факультэтаў раз-пораз падыходзілі да галоўнага суддзі і праглядалі пратаколы. Пасля стартаў дзяўчат на 3 і 5 кіламетраў, а таксама хлопцаў на 5 і 10 кіламетраў вырысоўваліся контуры агульнакаманднай барацьбы. Але нягледзячы на тое, што некаторыя факультэты не маглі змагацца за першае месца, здавацца датэрмінова ніхто не жадаў.

Свае карэктывы ў барацьбу ўнесла і надвор'е. Ноччу ішоў мокры снег, на дварах стаяў туман, лыжы «не ішлі». Спартсмены з цяжкасцю падбіралі мазь, знаходзячы аптымальны варыянт.

— На старт!—гучыць каманда старцёра, і лыжніцы выстрайваюцца па лініі.

Хто пераможа? Студэнткі гістарычнага факультэта, за які выступае двухразовая чэмпіёнка універсітэта майстар спорту СССР Галіна Цябус? Ці каманда ФПМ? А можа, іншыя факультэты ўмяшаюцца ў барацьбу?

Стартавалі дружна, і адна за другой дзяўчаты зніклі за паваротам. Наперадзе—тры кіламетры.

Спартсменкі на трасе ўжо пяць, сем, дзесяць мінут... «Восьмы нумар!». «Як хутка!»—здзівіўся нехта з выкладчыкаў. З-за павароту імкліва паказалася постаць лыжніцы ў чырвоным касцюме. Дзяўчына імчала так хутка, што фатографы, якія выбеглі наперад, не паспелі яе сфатаграфаваць. Алена Мазалеўская, студэнтка гістфака, паказвае выдатны вынік—11 мінут 30 секунд.

Толькі праз тры мінуты пачалі перадаваць эстафету іншыя каманды. Гістфак становіцца рэальным прэтэндэнтам на перамогу. Калі ж Тарэза Пашкевіч выйграла яшчэ некалькі секунд, то сумненняў у поспеху гістфака ўжо не было.

На другое месца прэтэндэнтаў было шмат. Мехмат і хімфак значна выйгравалі ў астатніх факультэтаў. Але пасля другога круга наперад выйшла каманда фізфака. Што гэта— сенсацыя? Дзяўчаты фізічнага факультэта ніколі не займалі такіх высокіх месц.

Раней за ўсіх пайшлі на фініш хімікі. Умяшаліся ў спрэчку лыжніцы ФПМ, фізфак адцясніўся на чацвёртае месца.

Каля фінішу стала цішэй. Ужо павіншавалі пераможцу, чакалі другога прызёра...

— Не павінна падвесці Люда Було,—хвалюецца трэнер фізфака В. В. Нікіцін.—Хоць яна і першакурсніца, але выступала нядрэнна.

І, як бы сцвярджаючы гэтыя словы, на трасе паказваецца Люда. А за ёю спартсменкі ФПМ і хімфака. «Хутчэй, хутчэй!»—крычаць лыжніцам таварышы. Не! Люда раней перасякае лінію фінішу. Трэцімі былі дзяўчаты ФПМ.

За хімфакам прыйшлі каманды мехмата, журфака, юрфака, радыефізікі, філфака, геафака. Біяфак каманды не выстаўляў.

Інакш склалася барацьба ў хлопцаў. Пяць кіламетраў з-за надвор'я прыйшлося замяніць на тры. Усе метры дыстанцыі трэба было праходзіць у самым высокім тэмпе.

Першы этап вывеў у лідэры каманду фізічнага факультэта. Але ўсяго 3 секунды уступала каманда ФПМ. Добра прайшоў гэты круг лыжнік філфака Васіль Супрун, які быў трэцім.

Фізфак павёў тактычную барацьбу. На другім этапе выступаў адзін з мацнейшых лыжнікаў факультэта Віктар Цішкевіч. У той жа час амаль усе астатнія каманды выставілі слабейшых. Цішкевіч далёка адарваўся і датэрмінова забяспечыў камандзе перамогу.



Цудоўна прабег дыстанцыю капітан каманды філфака Мікалай Жук. Ён дагнаў лыжніка ФПМ. Але павесці барацьбу за другое месца філфаку не ўдалося. Двухразовы пераможца першынства, студэнт ФПМ, майстар спорту СССР Віктар Баранскі даказаў сваё майстэрства. Ён нават паспрабаваў дагнаць лідэра. Але Валера Тутаў не даў гэтага зрабіць..



Практычна перад апошнім этапам усе тры прызавыя месцы былі вядомы. Віктар Ляпіцкі пад радасныя воклічы балельшчыкаў прынёс доўгачаканую перамогу фізфаку.

Звыш трох мінут прайграў фізфаку ФПМ і 5—філфак. А на чацвёртае месца выйшла каманда факультэта радыёфізікі і электронікі, якая абагнала ў вострай барацьбе юрфак. Пасля фінішавалі каманды гістфака, геафака, хімфака, журфака.

Агульнакамандная барацьба завяршылася перамогай ФПМ. У табліцы паказаны ачкі, якія набралі факультэты на лыжных спаборніцтвах.

| | | |
|---|---|---|
| 1. | ФПМ | 307 |
| 2. | Гістфак | 239 |
| 3. | Фізфак | 227 |
| 4. | Хімфак | 162 |
| 5. | Юрфак | 135 |
| 6. | Радыёфізікі і электронікі | 128 |
| 7. | Мехмат | 113 |
| 8. | Геафак | 93 |
| 9. | Філфак | 63 |
| 10. | Журфак | 50 |
| 11. | Біяфак | — |

**У. АБРАМОВІЧ,**
**наш кар.**

**НА ЗДЫМКАХ: пераможцы першынства універсітэта па лыжах у асабістым заліку майстры спорту СССР студэнтка гістфака Галіна Цябус і студэнт ФПМ Віктар Баранскі; самы цяжкі пад'ём; радасць адна на ўсіх.**

Фота П. Дзержановіча і аўтара.

СПОРТ

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

18 сакавіка 1982 г.

АТ 21171 Заказ 567

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ